аіВ
АДУКАЦЫЯ і ВЫХАВАННЕ 8'97



У нумары:

Пазашкольная дадатковая адукацыя

Прававое забеспячэнне сацыяльнай работы

Са слаўнага Полацка родам (Да 480-годдзя выдання першай беларускай кнігі Францыскам Скарынам)

Асвета на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.



## *Скрыжаванне думак*

# Этнапедагагічная падрыхтоўка будучых настаўнікаў

***В.С.Болбас,** кандыдат педагагічных навук*
*(Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут)*

*Пастаноўка на дзяржаўным узроўні пытання аб пабудове нацыянальнай школы патрабуе адпаведнай падрыхтоўкі і педагагічных кадраў. Важную ролю ў ёй павінна адыгрываць вывучэнне назапашанага народна-педагагічнага вопыту, без выкарыстання якога ўвогуле немагчыма стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі.*

Сучасная палеміка, што разгарнулася сярод навукоўцаў нашай рэспублікі, наконт таго, ці можа быць педагогіка нацыянальнай, самым адмоўным чынам уплывае на працэс далучэння будучых настаўнікаў і выхавальнікаў да педагагічнай спадчыны беларускага народа. І справа не толькі ў тым, што сусветны вопыт пераконвае ў важнасці і неабходнасці зберажэння нацыянальнай ідэнтычнасці дзеля задавальнення этнакультурных патрэб насельніцтва, а "чыста з педагагічнага" пункту гледжання апора менавіта на канкрэтны этнавыхаваўчы вопыт дазволіць вырашыць многія праблемы сённяшняга развіцця і ўдасканалення асветы. Народна-выхаваўчая практыка паказвае, што не толькі кожнай краіне патрэбна ўласная, адметная ад іншых дзяржаў школа, а і вучэбныя ўстановы розных этнічных супольнасцей, асобных рэгіёнаў і нават мясцовасцей павінны мець свае апірышчы на асаблівасцях культуры свайго этнасу, на характэрныя адрозненні навакольнага асяроддзя як прыроднага, так і сацыяльнага.

Нельга не бачыць, што адна з прычын выхаваўчых няўдач савецкай школы заключаецца якраз у тым, што не ўлічвалася наяўнасць уласных выхаваўчых сістэм кожнага народа былога СССР. З незлічонага мноства каранёў, што сілкавалі педагагічную думку, пакідаліся толькі тыя, якія, як лічылася, адпавядалі пастаўленым выхаваўчым мэтам. У глыбіні стагоддзяў педагагічныя даследчыкі заглядвалі з хірургічным скальпелем. Ка-

тэгарычна і самаўпэўнена адны выхаваўчыя ідэі і падыходы заносіліся ў разрад прагрэсіўных, іншым жа навешваўся ярлык рэакцыйных. А асобныя педагагічныя дасягненні, нават пры станоўчых да іх адносінах, на жаль, не запатрабаваны сучаснасцю. Так, народжаныя шматвяковай выхаваўчай практыкай і абгрунтаваныя вучонымі розных эпох прынцыпы культуразгоднасці і народнасці ў выхаванні практычна ігнаруюцца і па сённяшні дзень.

Спроба ж падмяніць асэнсаванне і вызначэнне самабытнай культуры нашых продкаў як цэласнай сістэмы акцэнтаваннем увагі толькі на асобных этнакультурных адметнасцях духоўнага жыцця беларусаў не можа даць добрага плёну ў выхаванні. Тым не менш такое выкарыстанне нацыянальных педагагічных набыткаў у асноўным назіраецца зараз і ў выхаваўчай практыцы, і пры арганізацыі адпаведнай падрыхтоўкі спецыялістаў, якія павінны ажыццяўляць гэты працэс.

З адладжанай жыццём і часам выхаваўчай сістэмы штучна вырываюцца асобныя падыходы, метады ці сродкі і без адпаведнага ўзгаднення з сучаснасцю нярэдка робіцца спроба "абагачэння" імі педагагічнай тэорыі і практыкі. Відавочна, што выйсце з такога становішча можа быць знойдзена толькі ў распрацоўцы і стварэнні нацыянальнай педагогікі, якая ўсебакова, навукова абгрунтавана зможа асвятляць усе пытанні пабудовы выхаваўчага працэсу ў этнічна-нацыянальных межах.

Колькі б нас ні палохала ўвядзенне такога тэрміна, альтэрнатывы гэтаму няма. Безумоўна, беларуская педагогіка не можа быць адарвана ад навуковай педагогікі, не можа разглядацца ні ў якасці нейкай прыступкі, ні як надбудова, ні як прыбудова ў параўнанні з нарматыўным курсам навуковай педагагічнай тэорыі. Яна з'яўляецца такім адгалінаваннем ад асноўнай навукі, якое мае самастойназначную якасць, хаця абсалютнай большасцю сваіх палажэнняў нацыянальная педагогіка арганічна ўваходзіць у навуковую педагогіку. Таму што, з аднаго боку, дзякуючы набыткам і напрацоўкам кожнага народа і стваралася навуковая педагагічная тэорыя, а з другога — уласныя педагагічныя дасягненні часта ўбіралі ў сябе вопыт іншых народаў. І ў той жа час педагагічная сістэма беларускага народа мае свае адметнасці на ўзроўні заканамернасцей, якіх не існуе ў сусветнай педагагічнай навуцы.

У рэшце рэшт, педагагічная культура — неад'емная састаўная частка агульнай сусветнай культуры, і гэтак жа, як тэрмін "нацыянальная культура", мае правa на існаванне ў такім жа стасунку і тэрмін "нацыянальная педагагічная культура". Дарэчы, ніякіх пярэчанняў не ўзнікае наконт патрэбнасці вылучэння ў самастойныя адгалінаванні "інжынернай педагогікі", "ваеннай педагогікі" і г.д. Намеры ж вывучэння, аналізу і сістэматызацыі педагагічных ідэй нашага народа, выяўленне адметных заканамернасцей і стварэнне на іх аснове ўласнай нацыянальнай педагогікі выклікаюць з боку многіх вучоных рэзкія пярэчанні, якія выліваюцца ў форму абвінавачвання ў ненавуковасці такіх падыходаў.

Якраз у перыяд падрыхтоўкі дадзенага артыкула ў часопісе "Адукацыя і выхаванне" № 10 за 1996 г. з'явілася публікацыя кандыдата педагагічных навук з г. Пінска Г.Ф.Вячоркі "Нацыянальна-педагагічныя зрухі", дзе аўтар пагаджаецца з перспектывай стварэння нацыянальнай сістэмы адукацыі і вы-

хавання ў Рэспубліцы Беларусь і ў той жа час рашуча пратэстуе супраць распрацоўкі тэорыі нацыянальнага выхавання. Безумоўна, калі давесці гэтую ідэю да спроб стварэння педагагічнай навукі, якая прэтэндуе на "нацыянальную выключнасць", "расцягнуць яе па суверэнных кутках" і прывесці да "навукова-педагагічнай ізаляцыі", то з паважаным Г.Ф.Вячоркам можна было б і пагадзіцца. Але ж ці аб такой нацыянальнай педагогіцы ідзе размова? Вучоны з Пінска часта прыпісвае сваім апанентам думкі, якія тымі і не выказваліся, а потым іх жа крытыкуе.

Вернемся да самага пачатку артыкула Г.Ф.Вячоркі, дзе ён спрабуе абвергнуць меркаванне А.А.Грымаця аб тым, што "педагогіка можа і павінна быць нацыянальнай навукай". Мінскі вучоны зусім не беспадстаўна падмацоўвае свае довады выказваннямі К.Дз.Ушынскага (дарэчы, сфармуляванымі не ў артыкуле "...Аб нацыянальным элеменце ў рускім выхаванні", а ў артыкуле "Педагогические сочинения Н.И.Пирогова" [5, *33*], які падкрэсліваў, што менавіта "выхаваўчыя ідэі кожнага народа прасякнуты нацыянальным больш, чым што-небудзь іншае". Звернем увагу: размова ідзе аб ідэях, а не аб выхаваўчай практыцы. Таму не зразумела, чаму Г.Ф.Вячорка, апелюючы да гэтага выказвання, спрабуе пераканаць, што К.Дз.Ушынскі меў на мэце "рускае выхаванне", а не педагагічную навуку [1, *99*].

У імкненні даказаць, што К.Дз.Ушынскі быў упэўнены ў існаванні самастойных нацыянальных сістэм выхавання, а не педагагічных тэорый, пінскі вучоны падкрэслівае яго вывад аб тым, што "наука не должна смешиваться с воспитанием. Она должна быть общей для всех народов...". Але і тут няма ніякіх супярэчнасцей. Па-першае, К.Дз.Ушынскі неаднаразова падкрэсліваў своеасаблівасць педагогікі як навукі. На яго думку, тэорыя педагогікі павінна абапірацца на аб'ектыўныя законы анатоміі, фізіялогіі, псіхалогіі, філасофіі і іншых навук. Заканамернасці развіцця чалавека, адкрытыя на аснове гэтага, і сапраўды будуць агульнымі для ўсіх народаў. І ў гэтым выпадку, бясспрэчна, аб нацыянальнай прыналежнасці педагогікі "не может быть и речи" [4, *69*]. Больш таго, вялікі вучоны ўдакладняе тое, што зусім не зразумелымі будуць выразы: "французская математика, английский закон тяготения... — точно так же **не имеет содержания и выражение: русская наука, если под этим выражением не разуметь той части науки, предметом которой является Россия, ее природа или ее история"** [4, *69*] (падкрэслена мною. — **В.Б.**).

Падобная залежнасць педагогікі ад суб'ектыўнага фактару дазволіла Ушынскаму заключыць, што "ни политика, ни медицина, ни педагогика не могут быть названы науками в этом строгом смысле, а только искусствами, имеющими своей целью не изучение того, что существует независимо от воли человека... Всякое искусство, конечно, может иметь свою теорию, но теория искусства — не наука" [3, *161—162*].

Вось чаму К.Дз.Ушынскі прапануе адрозніваць *"педагогику в обширном смысле слова"* ад *"педагогики в тесном смысле"*. Першая ўяўляе сістэму ведаў аб чалавеку. Аб гэтым сведчаць і напісаныя К.Дз.Ушынскім праграмы па педагогіцы, куды ўваходзяць веды па фізіялогіі, анатоміі чалавека, гігіене, псіхалогіі і г.д. Другая ж падаецца вучоным як *"со-*

*бранне правил воспитательной деятельности"* [3, *162—163*]. Відавочна, што такі збор выхаваўчых правілаў не можа быць аднолькавым у кожнай нацыі, кожнага народа.

Падобнае разуменне педагагічнай навукі дало падставу К.Дз.Ушынскаму зрабіць і такі вывад (дарэчы, у тым пераліку, на які спасылаецца Г.Ф.Вячорка, гэты вывад стаіць пад № 1): "Общей системы народного воспитания не существует, не только на практике, но и в теории, и **германская педагогика не более, как теория немецкого воспитания"** [4, *165*] (падкрэслена мною. — **В.Б.**). І крыху далей прыхільнік народнасці ў выхаванні катэгарычна заключае: "Как нельзя жить по образцу другого народа, как бы заманчив ни был этот образец, точно так же нельзя воспитываться по чужой педагогической системе, как бы ни была она стройна и хорошо обдумана. Каждый народ в этом отношении должен пытать собственные свои силы" [4, *165*]. Такім чынам, Ушынскі рашуча асуджаў спробы стварэння універсальнай, касмапалітычнай тэорыі выхавання, адзінай для ўсіх народаў.

Па-другое, вучоны не раздзяляў настолькі тэорыю і практыку выхавання, як гэта спрабуе рабіць Г.Ф.Вячорка. Ён не мог і думкі дапусціць, што народ можа мець уласную сістэму выхавання і не мець адпаведнай тэорыі, якая б "абслугоўвала" яе: "Нет такого педагога-практика, который бы не имел своей, хотя крошечной, хотя туманной теории воспитания" [4, *18*].

Падкрэсліваючы арганічнае адзінства педагагічнай тэорыі і практыкі, Ушынскі слушна адзначаў: "Связь фактов в их идеальной форме, идеальная сторона практики и будет теория в таком практическом деле, каково воспитание. Воевать против такой теории не значит ли то же, что воевать против мысли вообще" [4, *19*].

І ўжо зусім ніяк нельга пагадзіцца са сцвярджэннем Г.Ф.Вячоркі адносна таго, што народная педагогіка не можа ляжаць у аснове педагагічнай навукі. "І менавіта таму, — развawажае пінскі вучоны, — што народная педагогіка таксама не з'яўляецца, як зазначае К.Дз.Ушынскі, агульнай для ўсіх народаў" [1, *100*]. Сапраўды так, педагогіка любога асобнага народа не можа ляжаць у аснове навуковай педагогікі, бо ў падмурак апошняй якраз і ўваходзіць тое агульнае, што ўласціва ўсім народам свету, а ўласныя адметнасці і ўяўляюць аснову для развіцця самабытнай нацыянальнай педагогікі.

Што тычыцца перасцярог Г.Ф.Вячоркі наконт ідэй крайняга нацыяналізму, то, безумоўна, такія падыходы павінны рашуча адвяргацца. Але ж боязь таго, што, скінуўшы ідэалагічныя кайданы савецкага перыяду, педагогіка акажацца ў палоне нацыяналізацыі, наўрад ці мае падставу. І ўвесь гістарычны вопыт нашага народа, і першыя крокі на шляху да нацыянальнага адраджэння сведчаць якраз аб адваротным. Такі страх, калі толькі ён шчыры, хутчэй тлумачыцца народнай мудрасцю: "Хто апарыўся малаком, той і на халодную ваду дуе" [2, *298*].

Хацелася б таксама перасцерагчы, што як нельга ігнараваць магчымасці нацыянальнай педагогікі, так шкодна і яе фетышызацыя.

Паралельна з развіццём нацыянальнай педагогікі магчыма і нават ужо зараз неабходна практычнае ўзбраенне яе асноватворнымі палажэннямі ўсіх, хто займаецца справай выхавання падрас-

таючых пакаленняў, бо ў апошнія гады дзякуючы намаганням айчынных даследчыкаў многае зроблена па вывучэнні багацейшай педагагічнай спадчыны нашага народа.

Ужо на сучасным этапе асэнсавання этнапедагагічнага вопыту нашых продкаў можна вылучыць асноватворныя яго адметнасці, веданне і выкарыстанне якіх дапаможа павысіць эфектыўнасць і выніковасць выхаваўчага працэсу.

З сівой мінуўшчыны выхаванне падрастаючых пакаленняў лічылася нашымі прашчурамі самай прыярытэтнай справай. Нават клопат аб старасці выцясняўся на другі план. Са з'яўленнем на беларускіх землях хрысціянства выхаваўчыя накірункі грамадскай думкі паступова сталі набываць самастойны статус і яшчэ большую ўдзельную вагу. Выхаванне дабрачыннай, цнатлівай асобы становіцца галоўнай мэтай этнапедагогікі беларусаў. Пад этычным вуглом бачання разглядаліся многія праявы жыцця і існавання членаў людской супольнасці. Нягледзячы на тое што нашы продкі пакланяліся розуму і мудрасці, дабрыня ў іерархічнай лесвіцы грамадска значных вартасцей ставілася вышэй. Адукаванасць таксама высока цанілася ў народзе, але ж існавала цвёрдае перакананне, што “розум без дабрыні — гэта меч у руках вар'ята”.

Мудрасць і розум лічыліся неабходнымі, але далёка не дастатковымі прыступкамі на шляху да фармавання дасканалай асобы. Асноўныя пастулаты народнай педагогікі беларусаў пераконваюць: высакароднасць не перадаецца ў спадчыну, а набываецца шляхам уласных намаганняў індывіда. І такія ўяўленні на ментальным узроўні захаваліся да нашых дзён.

Хаця выхаваўчы працэс і не адрываўся ад сацыяльнага жыцця, але падкрэслівалася неабходнасць спецыяльнай яго арганізацыі ў грамадстве. На беларускіх землях раней нават, чым у Заходняй Еўропе, звярнуліся да адроджанай з антычнасці ідэі аб душы дзіцяці, як аб чыстай дошцы, на якой выхавальнік абавязаны напісаць дасягненні папярэдніх пакаленняў. Натуральна, без штучных рыўкоў і нуднага маралізавання да працэсу выхавання арганічна падключаліся сям'я, сваякі, суседзі, аднавяскоўцы, старэйшыя дзеці. На землях Бацькаўшчыны і на школы глядзелі ў першую чаргу як на “майстэрні чалавечых душ”.

Істотнай адметнасцю этнапедагагічнай думкі беларускага народа з'яўляецца яе скіраванасць да абшчыннасці, супольнасці, калектывізму. Нават у часы незвычайнага ўзлёту ідэй індывідуалізму ў іншых краінах на беларускіх землях арыентацыя да агульнага дабра не мянялася, хаця і напаўнялася абноўленым зместам.

Шчасце індывіда, яго ўласны дабрабыт у народным разуменні не могуць быць пабудаваны шляхам ушчамлення інтарэсаў іншых людзей. Гэтага нельга не ўлічваць пры распрацоўцы сучасных кірункаў індывідуалізацыі асобы, якія не могуць грунтавацца на пастулатах узвелічэння адных асоб за кошт іншых. Педагагічны геній беларускага народа выпрацаваў падыходы, якія дазваляюць узгадніць імкненне чалавека да асабістага шчасця з варункамі дасягнення агульнага дабра. Уласныя інтарэсы індывіда, згодна з народнымі перакананнямі, могуць і павінны быць гарманізаваны з грамадскімі.

Патрыятызм — характэрная і для іншых людскіх супольнасцей грамадзянска-маральная якасць — для беларусаў была сэнсам і крытэрыем

значнасці жыцця. У адрозненне ад іншых народаў свету тут з паняцця патрыятызму практычна выключалася помслівасць, ваяўнічасць, а напаўнялася яно шчырай любоўю, лірычнай замілаванасцю да роднай старонкі, “мілага куточка”.

Такія адносіны да радзімы, яе народа арганічна дапаўняліся любоўю і павагай да іншых краін і народаў свету. Нацыянальная самасвядомасць нашых продкаў не дапускала зняважлівых адносін да чужаземцаў, прадстаўнікоў іншых этнасаў. Фанабэрыя, нацыянальная пыхлівасць ні ў якой ступені не былі ўласцівы беларускаму народу, і на гэтым шляху ламаліся не толькі класавыя і саслоўныя, а нават і канфесійныя бар’еры.

У рэшце рэшт, адна з вызначальных рыс беларускага народа — талерантнасць — яскрава праявілася і ў адносінах да педагагічных набыткаў іншых народаў. Нашы продкі і тут далі нам добры прыклад, бо айчынная педагагічная думка, заўсёды абапіраючыся на ўласныя народнавыхаваўчыя набыткі, сінтэзавала і перапрацоўвала асноўныя палажэнні хрысціянскага веравучэння, культурныя дасягненні іншых народаў, іх багаты гістарычны вопыт.

Этнапедагагічныя ідэі нашага народа маюць і шэраг іншых характэрных асаблівасцей і заканамернасцей, якія нельга не ўлічваць у распрацоўцы сучасных выхаваўчых тэорый і ў практычнай арганізацыі выхаваўчага працэсу. Узбраенне імі будучых настаўнікаў і выхавацеляў — адна з неабходных умоў іх педагагічнай падрыхтоўкі. Падобная падрыхтоўка выпускнікоў педагагічных навучальных устаноў дазволіць арганізаваць вучэбна-выхаваўчы працэс з апорай як на нацыянальныя, так і на рэгіянальныя, мясцовыя асаблівасці вучнёўскага кантынгенту. Відавочна, што такая пастаноўка работы ў школе, у сваю чаргу, у якасці адваротнага працэсу будзе стымуляваць далучэнне саміх настаўнікаў да скарбніц народнай педагагічнай культуры.

Трэба адзначыць, што пэўныя захады па вырашэнні пастаўленай задачы прымаюцца зараз у многіх педагагічных навучальных установах, але галоўны іх недахоп заключаецца ў адсутнасці мэтанакіраванай, адладжанай, сістэмаўтваральнай работы. Абагульненне вопыту работы педагагічных навучальных устаноў краіны ў адзначаным кірунку дазваляе вылучыць асноўныя шляхі этнапедагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў. У якасці важнейшых адзначым наступныя.

1. Пры вывучэнні псіхолага-педагагічных дысцыплін можна ўзбагачаць змест любой тэмы адпаведным этнапедагагічным матэрыялам. Сюды могуць уваходзіць звесткі аб фізіялагічных, псіхалагічных асаблівасцях беларусаў, мэтах, змесце, прынцыпах, метадах і сродках народнай выхаваўчай сістэмы.

Пры выкладанні курса гісторыі педагогікі неабходна паказаць уклад беларускага народа ў развіццё сусветнай педагагічнай тэорыі і практыкі. Увогуле, у змест педагагічнай адукацыі трэба больш смелай і актыўна ўводзіць этнакультурныя элементы.

2. Адсутнасць адпаведных навучальных дапаможнікаў і навукова-тэарэтычных даследаванняў павінна ў пэўнай ступені кампенсавацца актыўным уключэннем выкладчыкаў педагагічных навучальных устаноў, навукоўцаў у працэс стварэння метадычных указанняў, падбору адпаведных матэрыялаў, у распрацоўку асобных тэм разглядаемага кірунку. Падобная работа актыўна праводзіцца ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсі-

тэце імя М.Танка, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце, Магілёўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.Куляшова.

3. Асабліва значную дапамогу ў этнапедагагічнай падрыхтоўцы студэнтаў павінны аказаць адпаведныя спецкурсы і спецсемінары, увядзенне якіх значна пашырылася ў апошнія гады ў многіх педагагічных ВНУ Рэспублікі Беларусь. Да гэтага трэба больш актыўна прыцягваць этнографаў, фалькларыстаў, даследчыкаў беларускай нацыянальнай культуры.

4. Актывізаваць вырашэнне разглядаемай праблемы заклікана вынясенне асобных тэм дысцыплін педагагічнага цыкла на семінарскія заняткі, напісанне адпаведных рэфератаў і дакладаў. Пэўныя зрухі ў абуджэнні цікавасці да нацыянальнай культуры могуць дапамагчы ў стварэнні навукова-даследчых студэнцкіх гурткоў, дзейнасць якіх будзе скіравана на вывучэнне педагагічных набыткаў нашага народа.

5. Шырэй варта выкарыстоўваць магчымасці самастойнай працы студэнтаў, у прыватнасці, праз напісанне курсавых і дыпломных прац.

6. Краязнаўча-пошукавыя студэнцкія экспедыцыі, практычная работа па зборы беларускага фальклору ва ўсіх рэгіёнах Беларусі значна дапоўніць і актывізуе намаганні па асэнсаванні і вывучэнні скарбаў народнай педагогікі.

7. У асобных навучальных установах (Беларускі педуніверсітэт, Мазырскі пединстытут і інш.) этнапедагагічныя пытанні з'яўляюцца абавязковым кампанентам правядзення педагагічных алімпіяд і конкурсаў.

8. Арганічны працяг павінна набыць падобная работа і пры арганізацыі вольнага часу студэнтаў. Гэта могуць быць адпаведныя тэматычныя вечарыны, сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі і культурнымі дзеячамі, чытацкія канферэнцыі, дыспуты і іншыя пазааўдыторныя формы работы.

9. Заслугоўвае ўвагі вопыт Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, дзе сістэматычна арганізуюцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі адпаведнай тэматыкі.

Несумненна, выніковасць такіх намаганняў у значнай ступені будзе залежаць ад зацікаўленасці і падрыхтаванасці выкладчыцкіх кадраў педагагічных навучальных установ, дзейнасць якіх у гэтым напрамку патрабуе пэўнай каардынацыі, практычнай дапамогі і кантролю з боку адпаведных органаў.

Пры гэтым трэба ўлічваць і той факт, што сацыяпедагагічная сітуацыя, якая рэальна існуе ў краіне, не спрыяе эфектыўнаму наладжванню такой работы, таму будаваць яе патрэбна ўзгоднена з наладжваннем працэсу павышэння ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў.

Наогул, можна сцвярджаць, што наспеў час, калі этнапедагагічная падрыхтоўка будучых настаўнікаў і выхавальнікаў павінна заняць значнае месца ў стандартах педагагічнай адукацыі, а гэта значыць, адпаведным чынам быць адлюстравана ў вучэбных праграмах і планах. Спадзяванні на тое, што ў далейшым выкарыстанне этнапедагагічных ідэй нашых продкаў будзе пашырацца, прыводзяць да высновы, што вельмі важна сфармаваць у сённяшніх студэнтаў перакананасць у неабходнасці дасведчанасці і пастаяннага самаўдасканалення ў адзначаным кірунку.

1. *Вячорка Г.Ф.* Нацыянальна-педагагічныя зрухі // Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 10. — С. 99—104.
2. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах. Кн. 2. — Мн., 1976.
3. *Ушинский К.Д.* Избранные педагогические сочинения. — Т. 2. — М., 1954.
4. *Ушинский К.Д.* Собр. соч. — Т. 2. — М. — Л., 1948.
5. *Ушинский К.Д.* Собр. соч. — Т. 3. — М. — Л., 1948.